УДК 069:351.853(476.5)

# Музееграфічны агляд з нагоды 30-годдзя самастойнасці Полацкага музея-запаведніка

**Джумантаева Т. А.**
*Навукова-даследчая і асветная ўстанова культуры*
*"Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік", Полацк*



*У артыкуле з музеeграфічнай пазіцыі прасочваецца шлях полацкіх музеяў ад калекцый музейнага характару да сучаснага музея-запаведніка. Асаблівая ўвага надаецца перыяду станаўлення функцыянальнай мадэлі музея-запаведніка. На прыкладзе Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка прасочваецца працэс генерацыі артэфактаў музеямі і стварэння ўмоў для музеефікацыі, як базавага прынцыпу развіцця музея-запаведніка. Адзначаецца, што багатая гісторыка-культурная спадчына старажытнага Полацка, музейныя традыцыі, у тым ліку і музеефікацыя гітарычнай тэрыторыі, спрыялі станаўленню функцыянальнай мадэлі запаведніка. Развіццё адносін традыцыйнага музея з гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі (нерухомыя аб'екты, тэрыторыі, ахоўныя зоны, традыцыі і г. д.) і іх трансфармацыямі нарадзіла інавацыйны тып музея, якім стаў гісторыка-культурны музей-запаведнік, прызваны адыграць асобую ролю ў культурным адраджэнні горада. Ён з'яўляецца часткай культурнай прасторы і адначасова формай яе функцыянавання.*

**Ключавыя словы:** *музей, музей-запаведнік, музеялогія, музеефікацыя.*

(Искусство и культура. — 2015. — № 4(20). — С. 75-81)

# Museographical Review on the Occasion of the 30th Anniversary of Independent Existence of Polotsk Museum-Reserve

**Jumantayeva T. A.**
*Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve, Polotsk*

*This article deals with the path of Polotsk museums from the ancient collections to the contemporary museum-reserve from the museology point of view. Special attention is drawn to the period of maturation of the functional model of the museum-reserve. Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve is regarded as an example of the generating of artefacts by Polotsk museums and creating conditions for musefication as a basic principle of the museum-reserve. It is noted that the rich historical and cultural heritage of Polotsk, museum traditions and musefication of historical territory contributed to the development of a functional model of the museum-reserve. The development of relations of the traditional museum and the historical and cultural heritage (buildings, territories, protected areas, tradition etc.) and their transformation have created an innovative type of the museum, the Museum-Reserve, which is called to play a special role in the cultural renaissance of the city. It is part of the cultural space and, at the same time, the form of its functioning.*

**Key words:** *museum, museum-reserve, museology, musefication.*

(Art and Culture. — 2015. — № 4(20). — P. 75-81)

Выключная каштоўнасць Полацка заключаецца ў аўтэнтычнасці, універсальнасці і агульначалавечнай значнасці яго культурных набыткаў. Без культурнай спадчыны немагчыма сучаснае існаванне Полацка і яго развіццё ў перспектыве. Спадчына паўплывала на фарміраванне асобага менталітэту палачан, падцвердзіла пераемнасць гуманістычных каштоўнасцей, падкрэсліла неафіцыйны статус культурнай сталіцы Беларусі, стварыла адбітны імідж Полацка ў свеце. Для Полацка спадчына мае такую ж значнасць, як для іншых рэгіёнаў прыродныя рэсурсы, мес-

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* muzey@vitebsk.by – **Т. А. Джумантаева**

Рэпозиторий ВГУ

цанараджэнне нафты ці алмазаў. Спадчына ўключана ў многія сацыяльныя працэсы і з'яўляецца крыніцай духоўнага абагачэння.

Полацк уяўляе сабой унікальную гістарычную тэрыторыю, помнікі якой ахоўваюцца, вывучаюцца, рэстаўруюцца і прыстасоўваюцца пад музейныя экспазіцыі. Нерухомыя помнікі (архітэктурныя, археалагічныя), якія знаходзяцца на тэрыторыі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, можна лічыць музейнымі прадметамі. Музейны збор запаведніка ўтрымлівае амаль 100 тысяч адзінак захавання. Сам запаведнік з яго ахоўнай зонай, існуючымі і будучымі музеямі, з'яўляецца ядром, вакол якога ствараюцца ўмовы для пераўтварэння гістарычнага Полацка ў горад-музей.

Музей, як сацыякультурны інстытут, з'яўляецца ў грамадстве, якое знаходзіцца на высокім узроўні сацыяльнага і культурнага развіцця. З моманту свайго з'яўлення ў еўрапейскай культуры Новага часу ён не толькі адлюстроўвае важныя тэндэнцыі развіцця культуры і грамадства, але, надзелены асобым сэнсам інстанцыі вечнасці, з цягам часу пачынае аказваць усё большы ўплыў на развіццё сацыякультурнай сферы. Усведамленне ўніверсальнасці і агульначалавечай значнасці культурнай спадчыны Полацкага рэгіёна садзейнічала не толькі развіццю музейнай справы, але і развіццю працэсу музеефікацыі асобных помнікаў і гісторыка-культурных тэрыторый [1].

Самастойным музейным аб'яднаннем і эксперыментальнай музеялагічнай пляцоўкай Полацкі музей-запаведнік стаў у жніўні 1985 г. У выніку тэарэтычных распрацовак стала відавочным, што шляхам музеефікацыі (галоўнай прыкметай якой з'яўляецца складанне музейных умоў на месцы існавання помніка) і ўключэння ў яе арбіту культурна-гістарычнага і ландшафтнага асяроддзя можна стварыць комплекс музеяў, звязаных адной ідэяй ці канцэпцыяй.

Мэта дадзенага артыкула – даследаваць этапы развіцця музейнай справы ў Полацку. Асаблівы інтарэс выклікае арганізацыйны працэс фарміравання функцыянальнай мадэлі музея-запаведніка.

**Музейныя традыцыі.** Музейныя традыцыі Полацка бяруць пачатак у XI–XII стст., калі ў Сафійскім саборы і Спасаўскім манастыры пачалі збіраць кнігі і абразы. Умоўна манастырскія скарбы можна назваць калекцыямі музейнага характару. Іх існаванне ў XI–XVIII стст. стала падмуркам, на якім са стварэннем музея ў Полацкім езуіцкім калегіуме (1788 г.) пачалося музейнае будаўніцтва ў горадзе.

Намаганнямі полацкіх езуітаў быў створаны буйны Музей пры езуіцкім калегіуме (1788–1820 гг.), які стаў адным з першых музеяў пры навучальных установах на тэрыторыі Беларусі. Вялікая колькасць музейных рэчаў была падзелена па добраапрацаваных калекцыях і экспанавалася ў залах трохпавярховага корпуса, які быў спраектаваны і пабудаваны генералам Ордэна Габрыэлем Груберам спецыяльна для музея. Музейны збор пашыраў кругагляд вучняў, далучаючы іх да агульначалавечых каштоўнасцей, выхоўваў мастацкі густ, спрыяў засваенню ведаў, абуджаў да даследаванняў гісторыі і прыроды Полацкага краю. Адукацыйна-выхаваўчая функцыя Музея езуіцкага калегіума і акадэміі заклала падмурак традыцый музейнай справы ў Полацку.

Галоўным укладам музеяў іншых навучальных устаноў (піярскага вучылішча і кадэцкага корпуса (у 1820–1918 гг.) [2, с. 6] у музейную справу разам з выкарыстаннем музейных калекцый у дыдактычных мэтах, стала навуковая і матэрыяльная фіксацыя жыцця і дзейнасці піяраў і кадэтаў. Прэзентацыя калекцый атрымала новае развіццё. Яны экспанаваліся на мастацка-прамысловых выставах, што праводзіліся ў Расіі і за мяжой. Адметнай рысай развіцця музейнай справы стала актыўная выставачная дзейнасць.

У перыяд, калі Полацк знаходзіўся ў складзе РСФСР (1918–1924 гг.), музейным будаўніцтвам займаліся аддзел народнай адукацыі, павятовая камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва і з 1925 г. – краязнаўчае таварыства [3]. Падрыхтоўка да стварэння Краязнаўчага музея супала з пачаткам адкрыцця першых савецкіх музеяў і выпрацоўкай асноўных заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі музейнае будаўніцтва на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, БССР і СССР. Адметнымі рысамі было прыцягненне да музеятворчай працы дарэвалюцыйных кадраў мастацкай і навуковай інтэлегенцыі, удала знойдзеныя арганізацыйныя формы ў справе збірання і захавання музейных каштоўнасцей, факт складання феномена

Рэпазіторый ВГУ

гарадскога музея, які ўвасобіўся ў працэсе музеефікацыі, і яго вылучэнне з аматарскага краязнаўчага руху.

Наступны перыяд музейнага будаўніцтва ў Полацку (1926–1967 гг.) пачаўся з адкрыцця Краязнаўчага музея. Нягледзячы на імкненне партыйнага кіраўніцтва БССР накіраваць музейную справу ў рэчышча ідэалагічнай падтрымкі сацыялістычнага будаўніцтва, Краязнаўчы музей садзейнічаў захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей і выхаванню самасвядомасці гараджан, кансалідаваў грамадства і стаў формай праяўлення дэмакратычнай самадзейнасці насельніцтва ў адносінах да нацыянальнай спадчыны. Працэс дэмакратызацыі ў галіне культуры, які пачаўся пасля 1956 г., павялічыў інтарэс грамадства да айчыннай гісторыі, што ў сваю чаргу паўплывала на стан музейнай справы і помнікаў архітэктуры. У 1960-х гадах комплексны падыход да вывучэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны стаў адметнай рысай дзейнасці Полацкага краязнаўчага музея, на базе якога ў 1967 г. быў створаны Полацкі гісторыка-археалагічны запаведнік [4].

**Дзяржаўны падыход да стварэння музея-запаведніка.** Да сярэдзіны 60-х гадоў ХХ ст. увага да багатай і разнастайнай архітэктурнай спадчыны старажытнага Полацка заставалася выключна акадэмічнай. Такое становішча змянілася з моманту ўтварэння ў 1965 г. Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і арганізацыі Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрань Міністэрства культуры БССР (з 1985 г. – Беларускае спецыялізаванае навукова-рэстаўрацыйнае вытворчае аб'яднанне "Белрэстаўрацыя"). У 1969 г. полацкі вытворчы ўчастак майстэрань пачаў работы па рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры.

Сваім з'яўленнем у Полацку гісторыка-культурны музей-запаведнік абавязаны Пастанове ЦК КПБ і СМ БССР ад 19.09.1967 г. (№ 318) "Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры"; працягам якой стаў яшчэ адзін дакумент, падпісаны 8 кастрычніка 1968 г. міністрам культуры БССР М. Мінковічам. Гэта было "Палажэнне аб гісторыка-археалагічных запаведніках" [5], у якім падрабязна гаварылася аб мэтах і задачах запаведнікаў, аб вызначэнні граніц, умовах карыстання помнікамі, аб археалагічных даследаваннях і аб гаспадарча-фінансавай дзейнасці запаведнікаў. 20 лістапада 1968 г. Полацкі гарадскі савет дэпутатаў прыняў Пастанову (№ 225) аб ахоўнай зоне вакол Сафійскага сабора. Віцебскім абласным саветам дэпутатаў ахоўная зона была зацверджана 17 кастрычніка 1969 г. (№ 16/8) і склала 31,3 га [5]. Згодна з Палажэннем аб гісторыка-археалагічных запаведніках, такім ахоўным зонам надаваўся статус філіяла пры мясцовым краязнаўчым музеі. Так з'явіўся Полацкі гісторыка-археалагічны запаведнік – філіял краязнаўчага музея, які, у сваю чаргу, быў філіялам Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Так, пачынаючы з 1967 г., сталі складвацца ўмовы не толькі для даследавання, як раней, але і для рэстаўрацыі і музеефікацыі помнікаў архітэктуры і археалогіі Полацка.

Першым на чарзе быў вядомы помнік архітэктуры – Сафійскі сабор. Яго рэстаўрацыя пачалася ў 1969 г., а ў снежні 1975 г., у выніку даследавання, былі выпрацаваны прапановы па кансервацыі і музеефікацыі помніка, аўтарамі якіх сталі вядомыя археолагі П. А. Рапапорт і В. А. Булкін. У сваіх прапановах па кансервацыі і музеефікацыі старажытных частак Сафійскага сабора археолагі раілі ўключыць рэшткі сабора сярэдзіны ХІ ст. у музейную экспазіцыю ў якасці экспанатаў. На іх думку, гэта магло б выклікаць інтарэс для наведвальнікаў. Падчас стварэння музея ў Сафійскім саборы гэтыя прапановы былі ўлічаны. Фрагменты падмуркаў, слупоў, старажытнай муроўкі сцен сталі часткай экспазіцыі. Яны экспануюцца ў ніжняй зале музея як артэфакты першай каменнай пабудовы на тэрыторыі Полацка. Прапанаваны варыянт быў прыняты экспазіцыянерамі і ўдала ўключаны ў аснову тэматыка-экспазіцыйнага плана стварэння музея. Сёння акрамя названых фрагментаў у экспазіцыйным поясе можна бачыць яшчэ і знаходкі, зробленыя падчас даследавання Сафійскага сабора і пляцоўкі вакол яго (пліткі падлогі ХІ ст., фрагменты фрэскавага роспісу, рэчы з пахавання XVI ст., віслую пячатку кіеўскага князя Усевалада (Андрэя) ХІ ст. [6], вапнавы камень з імёнамі сведкаў

Рэпазіторый ВДУ

будаўніцтва сабора ў XI ст., самыя цікавыя фрагменты плінфы са знакамі і надпісамі).

Нельга абмінуць увагай спробу стварэння ў Сафійскім саборы рэспубліканскага музея атэізму. Загад МК БССР (№ 188) ад 4 снежня 1973 г. [7] паведамляў аб адкрыцці ў Полацку ў адпаведнасці з пастановай Бюро ЦК КПБ ад 23 кастрычніка 1973 г. Рэспубліканскага музея атэізму.

Розным аддзелам і ўпраўленням Міністэрства культуры і абласных выканаўчых камітэтаў даручалася выпрацаваць прапановы па структуры, штатах і аўтарскім складзе калектыву для распрацоўкі генеральнага рашэння і афармлення экспазіцыі. Упраўленню па справах мастацтваў да 1 ліпеня 1974 г. трэба было даць прапановы аб магчымасці выкарыстання Сафійскага сабора ў якасці канцэртнай залы. Рэспубліканскім музеям было загадана скласці спісы музейных прадметаў, з якіх можна было б зрабіць копіі і муляжы для экспанавання ў музеі атэізму. Планаваліся стажыроўкі ў вядучых музеях СССР па атэістычнаму профілі. Быў зацверджаны склад камісіі па стварэнні Рэспубліканскага музея атэізму (Р. Р. Мачулін – намеснік міністра культуры БССР (старшыня); Ж. М. Сінельнікава – начальнік упраўлення (намеснік старшыні); Ю. М. Карачун – начальнік аддзела выяўленчага мастацтва; Н. А. Варатніцкая – старшы інспектар па музеях МК БССР; С. А. Друшчыц – галоўны архітэктар СНРВМ; Г. І. Клёсава – начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама; Т. Д. Рудава – загадчык аддзела культуры Полацкага гарвыканкама; Е. В. Аладава – дырэктар ДММ БССР; І. П. Загрышаў – намеснік дырэктара Дзяржмузея БССР; Д. Н. Шымук – загадчык метадычнага аддзела Дзяржмузея БССР; М. Я. Ленсу – кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Мінскага медінстытута).

Але ніводны з пунктаў загаду не быў выкананы. Праца па стварэнні музея атэізму была спланавана Міністэрствам культуры. Патрабаванне адкрыцця названага музея было выклікана атэістычным напрамкам у рабоце ўстаноў культуры без уліку мясцовай гісторыі і традыцый. Людзі, якія ўвайшлі ў склад камісіі, былі заняты сваімі праблемамі, бо працавалі ў рэспубліканскіх музеях ці ва ўстановах культуры абласнога і рэспубліканскага кшталту, далёка ад Полацка. Відавочна, згаданая пастанова ўтрымлівала толькі агульныя тэзісы, ускладваючы адказнасць за стварэнне музея атэізму на ўжо існуючыя рэспубліканскія музеі (Дзяржаўны музей БССР і Мастацкі музей БССР). Хутка з'явілася прапанова аб пераносе музея атэізму ў горад больш значны ў адміністрацыйным сэнсе, чым Полацк. Так, пачынаючы з другой паловы 1975 г., да чэрвеня 1977 г. калектыў музея (Герман Васільевіч Чарноў – дырэктар, бухгалтар і навуковы супрацоўнік Ніна Ляшчонак) чакаў пераводу музея з Полацка ў Гародню.

Увесь час стварэння музея атэізму (1973–1975 гг.) паралельна (на другім паверсе Сафійскага сабора) працаваў штат гісторыка-археалагічнага запаведніка, які ўзначальваў Іван Антонавіч Мацюшкін, чалавек апантаны, адданы справе стварэння запаведніка. Ужо ў тыя часы запаведнік меў шмат абразоў, драўляных скульптур, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Нязменнай памочніцай дырэктара па фондавай і навуковай рабоце была Жанна Сляпцова. Супрацоўнікі запаведніка нястомна працавалі над вывучэннем калекцый і падрыхтоўкай новай экспазіцыі ў Сафійскім саборы, рэстаўрацыя якога падыходзіла да завяршэння.

Нягледзячы на хуткую працу рэстаўратараў, у 1980 г. з'явілася Пастанова СМ БССР ад 10 ліпеня 1980 г. (№ 255) "Аб мерах па паляпшэнню аховы, рэстаўрацыі і выкарыстанню помнікаў гісторыі і культуры ў Беларускай ССР" [8], дзе канстатаваўся факт завяршэння стварэння музейнай экспазіцыі і канцэртнай залы ў Сафійскім саборы, але падкрэслівалася дрэнная праца па захаванню і рэгенерацыі забудовы старажытных гарадоў, у тым ліку і Полацка. Названая пастанова раіла разглядзець пытанне "комплекснай забудовы гісторыка-культурнага запаведніка ў горадзе Полацку і прыняць меры па забеспячэнню якаснага будаўніцтва ў ахоўнай зоне ў адзіным архітэктурна-мастацкім выкананні, а таксама добраўпарадкавання тэрыторыі, прымыкаючай да гісторыка-культурнага запаведніка".

У 1990 г. была прынята пастанова Савета Міністраў БССР № 158 "Аб Полацкім гісторыка-культурным запаведніку" [9] і зацверджана палажэнне "Аб Полацкім

Рэпазіторый ВДУ

гісторыка-культурным запаведніку рэспубліканскага значэння". Яно складалася з чатырох частак: агульныя палажэнні, мэты і задачы, рэжым утрымання запаведніка і зон яго аховы, адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры. У палажэнні былі пералічаны асобныя помнікі і комплексы помнікаў на тэрыторыі горада Полацка, якія ўключаны ў склад запаведніка і прызнаны маючымі навуковую, гістарычную, мастацкую і іншую культурную каштоўнасць. Палажэннем фіксавалася наяўнасць ахоўнай зоны запаведніка, зоны рэгулюемай забудовы і зоны ахоўваемага прыроднага ландшафту.

Змены ў сацыяльна-палітычным жыцці нашай краіны на працягу 1990-х гг. вымусілі ўнесці значныя карэкціроўкі ў існуючае рэспубліканскае заканадаўства ў галіне аховы спадчыны. Былі прыняты тры законы, якія ставілі на мэце падняць справу комплекснай аховы спадчыны на Беларусі на новы ўзровень (Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" ад 13 лістапада 1992 г., Закон Рэспублікі Беларусь "Аб асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях і аб'ектах" ад 20 кастрычніка 1994 г., Закон "Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" ад 5 верасня 1996 г. [10]). Нягледзячы на з'яўленне пэўных крокаў у фарміраванні падмурка комплекснага падыходу да аховы спадчыны, названыя дакументы не ўжывалі такія неабходныя для захавання спадчыны тэрміны, як "гісторыка-культурны музей-запаведнік", "унікальная гістарычная тэрыторыя", "тэрыторыя музея-запаведніка" і, адпаведна, не рэгламентавалі іх дзейнасць. Толькі ў Законе "Аб музеях" была зроблена спроба даць тлумачэнне паняцця "гісторыка-культурны музей-запаведнік". На жаль, па сённяшні дзень у Беларусі няма зацверджанага на ўрадавым узроўні тыповага палажэння "Аб гісторыка-культурным музеі-запаведніку".

**Функцыянальная мадэль музея-запаведніка.** Тым не менш, у музейным праектаванні 1980–1990 гг. вядучым стаў эксперыментальны напрамак, а ідэя музейнага аб'яднання на прынцыпах фарміравання цэнтралізаванай сістэмы музеяў розных тыпаў атрымала тэарэтычнае і практычнае абгрунтаванне ў межах Полацкага запаведніка. У 1992 г. Полацкім гарадскім выканаўчым камітэтам быў зацверджаны перспектыўны план музеефікацыі горада, разлічаны на перыяд да 2000 г. Далёка не ўсе пункты гэтага плана былі выкананы. Новыя эканамічныя ўмовы, якія склаліся падчас перабудовы, унеслі свае карэктывы ў тэрміны заканчэння рэстаўрацыі амаль усіх помнікаў архітэктуры. За гэты час змяніліся і погляды на прыярытэты ў музейнай справе, з'явілася цікаўнасць да інтэграваных экспазіцый і новых тэхналогій. 'Акрамя гэтага, былі зроблены карэктыроўкі ў плане рэгенерацыі цэнтральнай часткі старажытнага Полацка.

Традыцыі, якія былі характэрнымі для музейнага будаўніцтва ў Полацку, атрымалі якаснае праламленне ў бытаванні разнастайных тыпаў і відаў музеяў: ад музеяў навучальных устаноў (езуіцкага калегіума, піярскага вучылішча, кадэцкага корпуса) да вузкапрофільных музеяў у складзе запаведніка:

- Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора (з 1987 г.)
- Краязнаўчы музей (новая экспазіцыя існуе з 1986 г.)
- Музей беларускага кнігадрукавання (1990 г.)
- Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага (1994 г.)
- Музей баявой славы (1985 г.)
- Музей-кватэра Героя Савецкага Саюза З. М. Тусналобавай-Марчанка (1987 г.)
- Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я (1998 г.)
- Стацыянарная выстава «Прагулка па Ніжне-Пакроўскай» (1998 г.)
- Мастацкая галерэя (2002 г.)
- Дзіцячы музей (2004 г.)
- Прыродна-экалагічны музей (2005 г.)

Як паказвае аб'ектыўны аналіз гістарычнага развіцця полацкіх музеяў, ён мае тэндэнцыю да паскоранага развіцця. Сапраўды, калі ад моманту назапашвання першых калекцый і кнігазбораў пры Сафійскім саборы і манастырах да стварэння першага сапраўднага Музея пры езуіцкім калегіуме прайшло каля сямі стагоддзяў, а ад Музея калегіума – акадэміі – кадэцкага корпуса да першага Гарадскога цывільнага музея – каля стагоддзя, то ад моманту заснавання Полацкага музея-запаведніка да існуючых сёння 11 музеяў усяго 48 гадоў, 30

Рэпазіторый ВДУ

з іх – у якасці самастойнай навукова-даследчай і асветнай установы культуры.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік у сваёй структуры ўтрымлівае 11 музеяў і 65 аб'ектаў, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, што патрабуе ад яго правядзення шматаспектнай дзейнасці: навукова-даследчай, навукова-фондавай, захавальніцкай, адукацыйнай, выхаваўчай, інфармацыйнай, рэстаўрацыйнай, выставачнай, эканамічна-фінансавай, міжнароднай, культуратворчай, рэпрэзентатыўнай.

У Полацку працягваецца працэс музейнага будаўніцтва і музеефікацыі. Ён адлюстроўвае росквіт музеялогіі як навукі і характарызуецца вылучэннем функцыянальнай мадэлі далейшага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў сістэме "музей–культура–грамадства" з абавязковым і выкарыстаннем як традыцый, так і навуковых метадалогій і новых тэхналогій. Традыцыі, якія былі характэрнымі для кожнага з перыядаў музейнага будаўніцтва ў Полацку, атрымалі якаснае праламленне ў функцыянальнай мадэлі перспектыўнага развіцця Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Полацк, насычаны помнікамі архітэктуры і музеямі, захаваўшы гістарычную забудову XVIII – пачатку XX ст., здольны выканаць асноўную сацыяльную функцыю – дакументаваць культурна-гістарычнае асяроддзе – і стаць горадам-музеем. Паказальна і тое, што адбываецца не толькі выкарыстанне захаваных традыцый, але і пераход на новы якасны ўзровень асэнсавання неабходнасці музея, як найважнейшага сацыякультурнага інстытута, для самавызначэння нацыі.

**Заключэнне.** Такім чынам, адным з асноўных складальнікаў дынамічнага развіцця музейнай справы была роля выдатных асоб. Удзельнікамі музейнага будаўніцтва ў Полацку былі людзі розных прафесій і сацыяльнага становішча. Вучоныя з еўрапейскай адукацыяй на чале з Г. Груберам стварылі Музей езуіцкага калегіума. Выкладчыкі кадэцкага корпуса прымалі актыўны ўдзел у рабоце свайго музея, вывучалі гісторыю края, спрабавалі стварыць музей мясцовых помнікаў старасвецчыны, гурток аматараў археалогіі і "падземны музей" у Сафійскім саборы. Цікавасць да гісторыі краю сярод жыхароў Полацка заставалася традыцыйнай і досыць трывалай. Гэты перыяд музейнага будаўніцтва даў шмат імёнаў людзей, якія пакінулі надрукаваныя і рукапісныя ўспаміны пра сваё захапленне гісторыяй і ідэяй стварэння музея. Сярод іх: І. І. Даўгоў, А. К. Марэль, М. І. Зорын, А. П. Тыртаў, Я. Стаброўскі, М. Кайгародаў, В. П. Вікенцьеў і інш. Апантанныя ідэяй стварэння "універсальнага музея", аматары музейнай справы П. І. Дэйніс, І. П. Дэйніс, С. М. Мялешка здолелі адкрыць у Полацку ў 1926 г. Краязнаўчы музей. Сябры Камісіі па ахове помнікаў былі бліжэй за ўсіх да сучаснага разумення музея і музейнай справы. Пад "музеем" яны разумелі не толькі будынак, але і само гарадское асяроддзе, упершыню звярнуліся да праблемы захавання помнікаў архітэктуры і іх абавязковай музеефікацыі, што мела непасрэдны ўплыў на далейшае развіццё музейнай справы і з'яўленне феномена гарадскога музея ў Полацку. На першых этапах гэта былі аматары-краязнаўцы, у апошні час – прафесіянальныя музеёлагі. Усіх іх аб'ядноўвала ідэя стварэння музейнага асяроддзя ў гарадской прасторы і ператварэння Полацка ў горад-музей. Працэсу стварэння адпаведных умоў для рэалізацыі гэтай мэты паспрыяла дзейнасць дырэктараў гарадскога, а потым абласнога (1944–1954 гг.) краязнаўчага музея і музея-запаведніка: Дзідэнка Галіны Цімафееўны (да 1936 г.), Карэлінай Веры Аляксееўны (да 18 жніўня 1937 г.), Гатціха Васіля Аляксандравіча (1947–1953 гг.), Агурка Пятра Аляксандравіча (1953–1955 гг.), Казлёнка Мікалая Міронавіча (1955–1976 гг.), Хазіна Эмануіла Міхайлавіча (1977–1985 гг.), Мацюшкіна Івана Антонавіча (дырэктара гісторыка-археалагічнага запаведніка ў 1970–1974 гг.), Зайцавай Ядзвігі Афанасьеўны (1975–1981 гг.), Залілава Ігара Зуфіравіча (1982–1985 гг.), Рудавай Таццяны Давыдаўны (1985–1994 гг.), Ільніцкага Мікалая Мікалаевіча (1994–2006 гг.) [11].

Нягледзячы на складанасці ў сацыяльна-палітычным жыцці краіны на пачатку новага тысячагоддзя, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік у пэўнай ступені выступае як сімвал стабільнасці развіцця музейнай справы

Рэпазіторый ВДУ

краіны. Абапіраючыся на шматвекавую гісторыю і выконваючы сваю сацыяльную функцыю, ён далучаецца да выхавання паўнацэнных грамадзян – будаўнікоў сваёй краіны, творцаў будучыні. Ва ўмовах музеефікацыі цэлых гістарычных тэрыторый, як гэта адбываецца ў Полацку, працэс ідзе тым больш імкліва, чым больш хутка ён спрыяе далучэнню чалавека сённяшняга да спрадвечных гістарычных вартасцей свайго горада, рэгіёна, нарэшце, і краіны. Музей ужо сёння ёсць неад'емная частка самаідэнтыфікацыі народа, фарміравання яго самасвядомасці на падмурку спрадвечных агульначалавечых маральных каштоўнасцей і прынцыпаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Каулен, М. Е. Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен / – М.: Этерна, 2012. – 432 с.

2. Полацк музейны = Полоцк музейный = Museums of Polotsk: фотоальбом / аўт.-уклад.: Т. А. Джумантаева, М. М. Ільніцкі; фото І. У. Супранёнка; пер. с англ. Ю. В. Бажэнава. – Мінск: Беларусь, 2006. – 281 с.

3. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку (ЗДАП). – Ф. 54. – Воп. 1. – Спр. 342. Справа Полацкага павятовага аддзела народнай адукацыі. Пасяджэнні павятовай камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва 1920 г. Даклад 21 ліпеня 1920 г. сябра камісіі І. П. Дэйніса.

4. Гісторыка-археалагічны запаведнік [аб заснаванні Полацк. гіст.-археал. запаведніка] // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1970. – № 1. – С. 28.

5. Фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (ФНПГКМЗ) Фонд 5. – Пастановы Савета Міністраў. Пастанова ЦК КПБ і СМ БССР ад 19.09.1967 г. (№ 318) "Аб стане і мерах паляпшэння аховы помнікаў гісторыі, мастацтва і архітэктуры".

6. Булкін, В. А. Кіеўская пячатка ў Полацку / В. А. Булкін // Помнікі гісторыі і культуры. – 1979. – № 4. – С. 19–20.

7. Фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (ФНПГКМЗ) Фонд 6. – Загады Міністэрства культуры. Загад Міністэрства культуры БССР № 188 ад 4 снежня 1973 г. "Аб адкрыцці ў Полацку Рэспубліканскага музея атэізму".

8. Фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (ФНПГКМЗ). – Фонд 5. – Пастанова Савета Міністраў Беларускай ССР № 255 ад 10 ліпеня 1980 г. 'Аб мерах па паляпшэнню аховы, рэстаўрацыі і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры ў Беларускай ССР".

9. Фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (ФНПГКМЗ). – Фонд 5. – Пастанова Савета Міністраў Беларускай ССР № 158 ад 16 ліпеня 1990 г. "Аб Полацкім гісторыка-культурным запаведніку".

10. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-3: в ред. Закона Респ. Беларусь от 18.07.2007 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2008. Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь: Закон Рэспублікі Беларусь. 12 снеж. 2005 г., № 70-3: в ред. Закона Респ. Беларусь от 18.07.2007 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр» Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2008.

11.Музеі Полацка = Музеи Полоцка = Museums of Polotsk: фотоальбом / аўт.-уклад.: Т. А. Джумантаева; фото І. У. Супранёнка; пер. с англ. А. А. Далжонак. – Мінск: Беларусь, 2015. – 301 с.

*Паступіў у рэдакцыю 03.09.2015 г.*

Репозиторий ВГУ